**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па педагагічнай адукацыі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра
адукацыі Рэспублікі Беларусь
________________ І.А.Старавойтава
________________
Рэгістрацыйны № ТД________/тып.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
## (старажытны час – першая палова XIII ст.)

**Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасцей:**
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

**УЗГОДНЕНА**
Старшыня вучэбна-метадычнага
аб’яднання па педагагічнай
адукацыі
______________А.І.Жук
______________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення
прафесійнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_______________С.А.Каспяровіч
_______________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення
агульнай сярэдняй, дашкольнай
і спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____________М.С. Кіндзірэнка

**УЗГОДНЕНА**
Прарэктар па навукова-метадычнай
рабоце Дзяржаўнай установы
адукацыі “Рэспубліканскі
інстытут вышэйшай школы”
_______________І.У.Цітовіч
_______________

Эксперт-нормакантралёр
____________ _______________
_______________

Мінск 2021

**СКЛАДАЛЬНІК**
Трубчык П.А., дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў гістарычнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат гістарычных навук.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Кафедра гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 8 ад 29.04.2021);

Кадзіра У.М., дэкан гуманітарнага факультэта прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А.М.Шырокава», кандыдат гістарычных навук.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і славянскіх народаў гістарычнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” (пратакол № 13 ад 30.04.2021);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” (пратакол № 6 ад 26 мая 2021 );

Навукова-метадычным саветам па гуманітарнай адукацыі вучэбна-метадычнага аб’яднання па педагагічнай адукацыі
(пратакол № 5 ад 27 мая 2021 ).

Адказны за рэдакцыю: П.А. Трубчык
Адказны за выпуск: П.А. Трубчык

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Гісторыя Беларусі ўяўляе важную складовую частку славянскай, еўрапейскай і сусветнай цывілізацый і займае вядучае месца ў сістэме гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў. Менавіта на гістарычных ведах фарміруецца нацыянальная свядомасць. Без ведаў сваёй гісторыі немагчыма будаваць сучаснае краіны і прагназаваць яе развіццё на будучае.

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі (старажытны час – першая палова XIII ст.)» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасцях 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны», 1-02 01 02 «Гісторыя і сусветная мастацкая культура», 1-02 01 03 «Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа».

Дысцыпліна «Гісторыя Беларусі (старажытны час – першая палова XIII ст.)» вывучаецца ва ўзаемасувязі з археалогіяй Беларусі, краязнаўствам і этналогіяй Беларусі, крыніцазнаўствам гісторыі Беларусі, гісторыяй Расіі і Украіны са старажытных часоў да канца XVI ст., што дае магчымасць акцэнтаваць увагу студэнтаў на міждысцыплінарных сувязях, выявіць ролю і месца нашага народа ў шырокім прасторавым і часавым дыяпазоне.

**Мэтай** вывучэння вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца фарміраванне грунтоўных ведаў па гісторыі Беларусі са старажытнага часу па першую палову XIII ст. праз засваенне і асэнсаванне вучэбнага матэрыялу.

Для рэалізацыі вызначанай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных **задач**:

–фарміраванне ў студэнтаў навуковага светапогляду, крытычнага і творчага мыслення;

–высвятленне прычынна-выніковых сувязей і заканамернасцей гістарычнага развіцця беларускага народа ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі;

–фарміраванне ведаў аб этапах развіцця грамадства, археалагічнай перыядызацыі, археалагічных культурах Беларусі;

–усведамленне студэнтамі сістэмы матэрыяльных, культурных і духоўных каштоўнасцей беларускага народа, якія служаць падмуркам для аналізу сучаснасці і вызначэння перспектыў будучага;

–атрыманне тэарэтычных і практычных ведаў, якія дазволяць студэнтам правільна аналізаваць падзеі і факты гісторыі, рабіць неабходныя высновы і абагульненні;

–развіццё ўмення працаваць з спецыяльнай літаратурай (вучэбнай, даведачнай, навуковай, спецыялізаванымі перыядычнымі выданнямі), выкарыстоўваць атрыманыя веды для вырашэння інфармацыйна-пошукавых, навуковых і іншых задач.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

– асноўныя тэорыі грамадскага развіцця ў адпаведнасці з фармацыйным і цывілізацыйным падыходамі;

– асноўныя этапы фарміравання беларускага этнасу;

– асноўныя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры, культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа;

**умець:**

– выкарыстоўваць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы пры характарыстыцы заканамернасцяў і адметнасцяў гістарычнага развіцця беларускага соцыўма;

– ацэньваць асноўныя дасягненні матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі ў кантэксце гістарычнага развіцця і выкарыстоўваць культурна-гістарычную спадчыну Беларусі ў сваёй прафесійнай дзейнасці;

– тлумачыць уплыў розных культурна-цывілізацыйных фактараў на сацыяльна-эканамічнае, дзяржаўна-палітычнае, этнаканфесійнае і культурнае развіццё Беларусі;

– характарызаваць ролю і месца беларускіх земляў у рэгіянальным цывілізацыйным і геапалітычным развіцці;

**валодаць:**

– спосабамі адбору і сістэматызацыі гістарычнай інфармацыі;

– метадамі, формамі і сродкамі аптымізацыі, рацыяналізацыі і інтэнсіфікацыі адукацыйнага працэсу;

– здольнасцю самастойнага аналіза падзей гісторыі і іх выкарыстання ў працэсе выкладання.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (старажытны час – першая палова XIII ст.)» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў універсальнай і базавай прафесійнай кампетэнцый:

– УК-9. Выяўляць фактары і механізмы гістарычнага развіцця, вызначаць грамадскую думку гістарычных падзей.

– БПК-14. Валодаць сістэмай ведаў, якія дазваляюць вызначаць асноўныя перыяды, тэндэнцыі і заканамернасці сацыяльных, эканамічных, палітычных, этна-нацыянальных, рэлігійна-канфесійных і культурных падзей і працэсаў, якія праходзілі на тэрыторыі Беларусі.

Пры вывучэнні кожнай тэмы студэнты павінны навучыцца карыстацца як агульнанавуковымі (мадэліравання, індукцыі і дэдукцыі, сінтэзу і аналізу, узыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага і наадварот, аналогіі і інш.), так і канкрэтна-гістарычнымі (гісторыка-генетычным, гісторыка-параўнальным, гісторыка-тыпалагічным, гісторыка-сістэмным і інш.) метадамі гістарычнага пазнання.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (старажытны час – першая палова XIII ст.)» вучэбнам планам адводзіцца для спецыяльнасцей 1-02 01 01 “Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны”, 1-02 01 02 “Гісторыя і сусветная мастацкая культура”, 1-02 01 03 “Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа” 108 гадзін (3 зал. адз.), з іх аўдыторных – 48

гадзін (лекцыі – 20, семінарскія заняткі – 28). На самастойную работу адводзіцца 60 гадзін. Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на 1 курсе. Залік – 1 семестр.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № | Назва раздзела, тэмы | Усяго аўдыторных гадзін | Размеркаванне аўдыторнага часу па відам заняткаў | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Лекцыі | Семінары |
| **РАЗДЗЕЛ 1. ПЕРШАБЫТНАЕ ГРАМАДСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (100 ТЫС. ГАДОЎ ДА Н.Э. – V СТ. Н.Э.)** | | **22** | **10** | **12** |
| 1.1 | Уводзіны ў дысцыпліну “Гісторыя Беларусі (старажытны час – першая палова XIII ст.)”. Першапачатковае засяленне. Насельніцтва каменнага веку | 8 | 4 | 4 |
| 1.2 | Насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў эпоху бронзы і ранні́м жалезным веку | 8 | 4 | 4 |
| 1.3 | Культура, побыт і звычаі старажытных людзей на тэрыторыі Беларусі | 6 | 2 | 4 |
| **РАЗДЗЕЛ 2. БЕЛАРУСЬ У VI – СЯРЭДЗІНЕ XIII СТ.** | | **26** | **10** | **16** |
| 2.1 | Балты і славяне ў VI – VIII стст. | 2 | 2 | |
| 2.2 | Узнікненне класавага шматукладнага грамадства ў IX – першай палове XIII ст. | 6 | 2 | 4 |
| 2.3 | Полацкае княства ў IX – першай палове XIII ст. | 2 | | 2 |
| 2.4 | Княствы і гарады на тэрыторыі паўднёвай Беларусі, Пасожжа і Верхняга Панямоння | 4 | 2 | 2 |
| 2.5 | Барацьба з крыжацкай агрэсіяй і нашэсцем мангола-татараў | 6 | 2 | 4 |
| 2.6 | Рэлігія і культура на беларускіх землях у IX – першай палове XIII ст. | 6 | 2 | 4 |
| | **УСЯГО:** | **48** | **20** | **28** |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ 1. ПЕРШАБЫТНАЕ ГРАМАДСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (100 тысяч гадоў да н.э. – V ст. н.э.)

### Тэма 1.1. Уводзіны ў дысцыпліну “Гісторыя Беларусі (старажытны час – першая палова XIII ст.)”. Першапачатковае засяленне. Насельніцтва каменнага веку.

“Гісторыя Беларусі (старажытны час – першая палова XIII ст.)” як навучальная дысцыпліна. Змест і структура курса. Характарыстыка вучэбнай літаратуры. Гістарыяграфія. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы.

Пачатак засялення чалавекам тэрыторыі сучаснай Беларусі. Гістарыяграфія пытання. Сляды знаходжання першых пасяленцаў, старажытныя стаянкі. Неандэртальцы і краманьёнцы. Умовы жыцця, прылады працы і зброя, асноўныя заняткі. Крэмнездабываючая справа. Мацярынская радавая абшчына як сацыяльная арганізацыя. Плямёны і археалагічныя культуры каменнага веку, меркаванні аб іх этнічнай прыналежнасці. Рэлігійныя вераванні і абрады. Першабытнае мастацтва.

### Тэма 1.2. Насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў эпоху бронзы і раннім жалезным веку.

З’яўленне індаеўрапейцаў, іх балцкая галіна на беларускіх землях. Узаемадзеянне з даіндаеўрапейскім насельніцтвам. Узнікненне і развіццё вытворчых формаў гаспадарання. Плаўка і апрацоўка металаў. Зараджэнне грамадскага падзелу працы. Першапачатковы абмен. Бацькоўскі (патрыярхальны) род. Матэрыяльная і духоўная культура плямён бронзавага і жалезнага вякоў.

### Тэма 1.3. Культура, побыт і звычаі старажытных людзей на тэрыторыі Беларусі.

Гістарыяграфія пытання. Сувязь творчай дзейнасці з працай чалавека, кліматычнымі і геаграфічнымі ўмовамі, спосабамі гаспадарання, сацыяльным асяроддзем, філасофскімі і рэлігійнымі ўяўленнямі. Сінкрэтызм першабытнай культуры. Узнікненне веры старажытных людзей у звышнатуральныя ўласцівасці неадушаўлёных прадметаў. Фантастычныя ўяўленні аб роднасці груп людзей з татэмамі – пэўным відам жывёл, раслін і прыродных з’яў. Разнастайнасць і разгалінаванасць паганства. Вера балтаў і ранніх славян у існаванне шматлікіх багоў. Сонечны культ і культ агню. Персанажы народнай дэманалогіі. Вербальная і невярбальная магія, замовы, праклёны. Ушанаванне продкаў, пахавальныя рытуалы, памінкі. Музычныя інструменты, мастацкія вырабы і ўпрыгожванні. Арнаментнае аздабленне глінянага посуду і прылад працы. Старажытная скульптура Беларусі. Керамічныя рэльефныя ўзоры. Характар і традыцыі выяўленчага мастацтва Беларусі ў старажытнасці.

## РАЗДЗЕЛ 2. БЕЛАРУСЬ У VI – СЯРЭДЗІНЕ XIII ст.

### Тэма 2.1. Балты і славяне ў VI – VIII стст.

Тэрмін “сярэднявечча”, яго сэнс. Храналагічныя рамкі. Нераўнамернасць развіцця сярэднявяковых цывілізацый. Гістарыяграфія і аналіз крыніц.

“Вялікае перасяленне” народаў у Еўропе і насельніцтва Беларусі. Банцараўская, калочынская, пражская і іншая археалагічныя культуры. Змешанае пражыванне славян з балтамі. Канчатковы распад патрыярхальнага роду. Заняткі насельніцтва, рэлігійныя вераванні, пахавальныя абрады. Ваенная дэмакратыя і зараджэнне дзяржаўнасці ў славян.

### Тэма 2.2. Узнікненне класавага шматукладнага грамадства ў IX – першай палове XIII ст.

Аб’яднанні крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў. Плямёны яцвягаў, літоўцаў у Верхнім Панямонні. Славянізацыя мясцовага балцкага насельніцтва. Асноўныя канцэпцыі аб паходжанні беларусаў, вялікаросаў, украінцаў. Трансфармацыя радавой абшчыны ў суседскую. Шматукладнае грамадства. Зараджэнне феадалізму. Сінтэзны і бяссінтэзны шляхі развіцця феадалізму. Сельская гаспадарка. Рамяство. Гандаль. Узнікненне гарадоў. Сацыяльная дыферэнцыяцыя насельніцтва. Сяляне-земляробы. Знаць і дружына. Княжацкая ўлада.

### Тэма 2.3. Полацкае княства ў IX – першай палове XIII ст.

Першыя пісьмовыя звесткі аб Полацку. Кіеўская Русь. Узаемаадносіны Полацка з Кіевам і Ноўгарадам. Полацкая дынастыя князёў. Рагвалод. Рагнеда. Захоп Уладзімірам Святаслававічам Полацкай зямлі. Аднаўленне незалежнасці. Полацкі князь Ізяслаў. Узмацненне Полацкага княства ў XI ст. Брачыслаў, Усяслаў Чарадзей. Бітва на Нямізе. Паўстанне ў Кіеве 1068 г. і абранне Усяслава Полацкага вялікім князем кіеўскім. Вяртанне Усяслава ў Полацк. Апошнія спробы кіеўскіх князёў падпарадкаваць Полацк і Менск. Барацьба паміж Полацкам і Менскам у другой палове XII ст. Грамадска-палітычны лад у Полацкай зямлі-княстве. Рысы сярэднявечнай рэспублікі ў Полацку. Гарады Полацкай зямлі. Феадальная раздробленасць. Распад Полацкай зямлі на ўдзельныя княствы (гарады-дзяржавы): Полацкае, Віцебскае, Менскае, Друцкае, Ізяслаўскае, Лагожскае.

### Тэма 2.4. Княствы і гарады на тэрыторыі паўднёвай Беларусі, Пасожжа і Верхняга Панямоння

Тураўскае княства. Бярэсце – гістарычны цэнтр Сярэдняга Пабужжа. Выдзяленне Драгічына над Бугам у якасці ўдзельнага княства. Смаленскія крывічы. Узнікненне і развіццё Слаўгарада і Крычава. Мсціслаў і Мсціслаўскае ўдзельнае княства. Узнікненне Гомеля як племяннога цэнтра радзімічаў. Развіццё горада ў X—XIII стст. Чачэрск і Рэчыца. Мазыр і Брагін – дрыгавіцкія гарады ў складзе Кіеўскага княства. Беларускія княствы і

гарады ў Верхнім Панямонні. Гарады Гародня, Ваўкавыск, Слонім, Наваградак і Наваградская зямля. Пачатак барацьбы з рыцарамі-крыжакамі. Кукенойскае і Герцыкскае княствы - фарпосты Полацкай зямлі ў ніжнім цячэнні Заходняй Дзвіны. Князь Вячка, Уладзімір Полацкі, Якаў Палачанін, Давыд Гарадзенскі. Перадумовы ўтварэння беларуска-літоўскай дзяржавы. Міндоўг і яго барацьба з галіцка-валынскім княствам за валоданне Верхнім Панямоннем. Узаемаадносіны Міндоўга з Ордэнам і Полацкам. Каранацыя Міндоўга ў Наваградку. Узвышэнне Наваградскага княства. Інтэграцыя насельніцтва Беларусі з суседнімі народамі ў межах адзінай дзяржавы. Дыскусія пра летапісную назву "Літва" і яе этнічнае паходжанне.

**Тэма 2.5. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй і нашэсцем мангола-татараў.**

Знешнепалітычнае становішча беларускіх зямель у пачатку XIII ст. Напад нямецкіх феадалаў на Усходнюю Прыбалтыку і Полацкую зямлю. Кукенойскі князь Вячка, герцыкскі князь Усевалад, полацкі князь Уладзімір – арганізатары змагання супраць крыжакоў. Удзел палачан у разгроме шведскіх захопнікаў у бітве на Няве (1240). Роля насельніцтва беларускіх зямель у стрымліванні нямецкага прасоўвання на ўсход у XIII ст. Легендарныя звесткі аб сутыкненнях з войскамі мангола-татараў на землях Беларусі ў сярэдзіне XIII ст. Бітва каля Магільна. Роля беларускага народа ў барацьбе з мангола-татарамі.

**Тэма 2.6. Рэлігія і культура на беларускіх землях у IX – першай палове XIII ст.**

Паганскія вераванні. Прыняццё і распаўсюджванне хрысціянства. Двуяверства. Значэнне прыняцця хрысціянства. Пісьменства. Летапісы і рукапісныя кнігі. Літаратура. Пісьменства па археалагічных помніках. Вусная народная творчасць. Паданні пра Рагнеду і Усяслава Чарадзея. Звычаі і абрады. Народны каляндар. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы Беларусі: Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Аўраамій Смаленскі. Манументальнае дойлідства Полацкай зямлі і Панямоння. Абарончае дойлідства XIII ст. Архітэктурныя школы. Манументальны жывапіс. Кніжная графіка. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Развіццё перадумоў фарміравання беларускай народнасці.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

### Асноўная

1. Новик, Е. К. История Беларуси. С древнейших времён до 2013 г.: учебное пособие / Е.К.Новик, И.Л.Качалов, Н.Е.Новик. – 4-е изд. испр. и доп. – Минск : Вышэйшая школа, 2013. – 558 с.

2. Ковкель, И. И. История Беларуси: с древнейших времен до нашего времени / И.И. Ковкель, Э.С. Ярмусик. – Минск : Аверсэв, 2008. – 621 с.

3. Гісторыя Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://elib.psu.by:8080/handle/123456789/9118. – Дата доступу: 20.05.2021.

4. История белорусской государственности: в 5 т. Т. 1 : Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. тома: О. Н. Левко, В. Ф. Голубев; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларуская навука, 2018. – 598 с.

### Дадатковая

1. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экоперспектива, 2000–2005. – Т. 1 : Старажытная Беларусь: аАд першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал.: М.Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – 2000. – 351 с.

2. История Беларуси в контексте европейской цивилизации : учеб. пособие / С. А. Елизаров [и др.]. – 2 изд., испр. – Минск : Высш. шк., 2016. – 398 с.

3. История Беларуси в контексте мировых цивилизаций : учеб. пособие / В. И. Голубович [и др.] ; под ред. Н. И. Полетаевой, А. М. Сасим. – Минск : Экоперспектива, 2017. – 147 с.

4. Нагаев, А. С. Практикум по истории СССР с древнейших времен до конца XVII в.: учеб. пособие для студентов-заочников 1 курса ист.фак. пед. ин-тов / А.С. Нагаев, В.Н. Огнев. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Просвещение, 1991. – 191 с.

5. Новик, Е. К. История Беларуси: с древнейших времен до 2013 г. : учеб. пособие для студентов высш. образования / Е. К. Новик, И. Л. Качалов, Н. Е. Новик ; под ред. Е. К. Новика. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск : Выш. шк., 2013. – 558 с.

6. Беларускія летапісы і хронікі / Уклад. У. Арлова. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – 430 с.

7. Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 3 т. Т. 1. – Мінск : Белкартаграфія, 2009. – 244 с.

8. Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды / М. Ермаловіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. — 366 с.; іл.

9. Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя / Рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 1993. — 702 с.; іл.

10. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : 2 т. Т. 1 / Рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2009. — 496 с.; іл.
11. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. Т. 2 / Рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2011. — 464 с.; іл.
12. Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. / Г. Сагановіч. — Мнінск : Энцыклапедыкс, 2001. — 412 с.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для дыягностыкі кампетэнцый могуць выкарыстоўваюцца наступныя формы:

1. Вусная форма:

– гутарка;

– даклады на семінарах;

– вусная прэзентацыя вынікаў самастойнай работы студэнтаў.

2. Пісьмовая форма:

– тэсты;

– пісьмовыя кантрольныя работы;

– пісьмовая прэзентацыя вынікаў самастойнай работы студэнтаў

– пісьмовы залік.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі (старажытны час – першая палова XIII ст.»

### Арганізацыя самастойнай работы

Для паспяховага выканання самастойнай работы студэнтаў неабходна планаванне і кантроль з боку выкладчыкаў. Аўдыторная самастойная работа выконваецца студэнтамі на лекцыя і семінарскіх занятках. Для гэтага выкладчык загадзя распрацоўвае і выбудоўвае сістэму самастойнай работы, улічваючы ўсе яе формы, мэты, ажыццяўляе адбор неабходнай інфармацыі і сродкі (метадчных) камунікацый, вызначае ролю студэнта ў гэтым працэсе і свой удзел у ім. Пытанні для самастойнай работы студэнтаў, якія прыведзены ў рабочай праграме дысцыпліны, прапаноўваюцца выкладчыкамі напачатку вывучэння дысцыпліны. Студэнты маюць права дадаткова выбіраць тэмы, якія іх цікавяць, для самастойнай работы.

**Віды самастойнай работы студэнтаў**

| | |
|---|---|
| *Рэпрадуктыўная самастойная работа* | Самастойнае чытанне, прагляд, канспектаванне вучэбнай літаратуры, запамінанне, пераказ, паўтарэнне вучэбнага матэрыялу і г. д. |
| *Пазнавальна-пошукавая самастойная работа* | Падрыхтоўка паведамленняў, дакладаў, выступленняў на семінарскіх і практычных занятках, падбор адпаведнай літаратуры, напісанне рэфератаў, курсавых, дыпломных работ і г. д. |
| *Творчая самастойная работа* | Удзел у навукова-даследчай рабоце, навуковых мерапрыемствах, выкананне творчых праектаў па індывідуальных і групавых заданнях і г. д. |